**Тэма: МІКОЛА ГУСОЎСКІ. ПАЭМА «ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА». Тэма Радзімы ў паэме**

**Мэта: мяркуецца, што напрыканцы ўрокаў вучні:**

**будуць ведаць:** жыццё і дзейнасць Міколы Гусоўскага, гісторыю стварэння паэмы «Песня пра зубра», засяродзіўшы ўвагу на характарыстыкі князя Вітаўта, сімвалічнае значэнне вобраза зубра, ролю аўтара-апавядальніка:

**авалодаюць паняццямі:** гуманізм у лігаратуры:

**удасканаляць навыкі:** складання стужкі часу, запаўнення апорнай табліцы, стварэння логіка-сэнсавай мадэлі, работы з мастацкім тэкстам.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для абуджэння патрыятычных пачуццяў, павагі да гісторыі роднага краю і гістарычных асоб; развіцця інтэлектуальных здольнасцей, аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.

**Абсталяванне:** партрэт Міколы Гусоўскага; дакументальная стужка «Гісторыя Беларусі. Песня пра зубра»; мастацкая стужка «Песня пра зубра» (рэж. Э. Перагуд, Беларускае тэлебачанне «Тэлефільм», і980); відэаролік «Гуманізм у літаратуры».

**Эпіграфы:** «Мікола Гусоўскі — сапраўдны волат эпохі Адраджэння, які найбольш поўна і ярка ўвасобіў у сабе духоўную веліч народа, яго розум і паэтычны геній» (Ніл Гілевіч).

«Песня пра зубра» належыць да тых твораў паэзіі, якія прынята зваць паэмамі жыцця. У кожнага пісьменніка можа быць толькі адзін такі твор, і тым не менш імя яго аўтара назаўжды прапісваецца ў пантэоне роднай літаратуры» (Уладзімір Калеснік).

**Ход урока**

**I. Арыенціровачна-матывацыйны этап.**

1.1. Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

**1.2. Актуалізацыя раней вывучанага.**

**Здача выкананых літаратурных дыктантаў на праверку настаўніку.**

**1.3. Слова настаўніка.**

Поруч з Францыскам Скарынам эпоха Адраджэння назаўсёды ўпісала у гісторыю літаратуры і культуры Беларусі імя яшчэ аднаго волата — **выдатнага паэта-лацініста, аўтара славутай паэмы «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага.**

Сын велікакняжацкага лоўчага, бліскуча адукаваны дыпламат-дарадца і паэт, ён узышоў на алімп еўрапейскай лацінамоўнай літаратуры з лясных паляўнічых сцежак роднага краю, з патаптаных і здратаваных татарскімі коньмі сялянскіх палёў, з бальшакоў і цярністых шляхоў, якімі хадзілі некалі на ворага ў часы грознага і слаўнага Вітаўта нашы продкі.

**1.4. Ключавое пытанне ўрока.**

- ✓ **«Наколькі, на вашу думку, Міколу Гусоускаму удалося выкакаць сваё «самае высакароднае прызначэнне» і пакінуць неацэнны духоўны скарб нашчадкам?»**

**1.5.Мэтавызначэнне.**

**II. Пазнавальны этап.**
**2.1. Прыкладпы змест лекцыі.**
**Заданне. Падчас слухання вучням прапануецца запоўніць логіка-сэнсавую мадэль «Мікола Гусоўскі».**

Мяркуецца, што славуты паэт нарадзіўся каля 1470—1480 гадоў у адным са шматлікіх на Беларусі паселішчаў ці нават лясным пушчанскім хутары з назваю Гусава, Усава ці Уса, ад якога, відаць, і ўзяў сабе прозвішча — Гусоўскі.

Першаю школаю здольнага і адоранага ад прыроды юнака сталі пушча і лавецкія княжацкія дружыны, што зімой і летам гойсалі па ёй, здабываючы звера для велікакняжацкага двара альбо правіянт для войска. У пушчах з часоў Ягайлы і Вітаўта рыхтавалі да войнаў ратнікаў і нявопытную моладзь. Прырода і людзі, цяжкая праца і небяспечныя паляванні на звера абуджалі дапытлівы розум, гартавалі волю і характар юнака, памнажалі жыццёвы вопыт.

Пра гэты час, што правёў будучы паэт у асяродку мужных і згуртаваных людзей, ад якіх засвоіў няпісаныя законы шляхецкай годнасці і абавязку, сяброўства і дружбы, ён будзе ўспамінаць у паэме як пра самую каштоўную і памятную навуку свайго жыцця: «Як ні было — не забыць сваю школу Міколу». Крыху пазней да жыццёвай навукі далучацца летапісы і творы славянскага кірылічнага пісьма, якія адкрыюць яму гераічны свет роднай гісторыі, стануць яшчэ адной школай выхавання патрыятычных пачуццяў любові і павагі да сваёй айчыны.

Кніга і кніжная мудрасць прыйшлі да будучага паэта з велікакняжацкага асяродку, прадстаўнікі якога бавілі на паляваннях і ловах любую вольную гадзіну. Сына лоўчага запрыкмеціў сакратар велікакняжацкай канцылярыі ў Вільні Эразм Вітэліус, які ацаніў здольнага юнака, дапамог атрымаць грунтоўную адукацыю ў адным з заходне-еўрапейскіх універсітэтаў, увёў у новы для яго свет лацінскага мастацтва і культуры. Здольны палітык, палітык, Эразм Вітэліус зрабіў бліскучую кар'еру дыпламата. Ён карыстаўся асаблівым даверам у караля Аляксандра, які тройчы пасылаў яго з дыпламатычнымі місіямі ад Вялікага княства Літоўскага і Польскага Каралеўства ў Ватыкан. У якасці сакратара Гусоўскі суправаджаў свайго апекуна і мецэната ў апошнім пасольстве ў Рым у 1518—1522 гадах.

Пасольства павінна было пераканаць папу Льва X Медычы ў неабходнасці стварыць шырокую кааліцыю еўрапейскіх дзяржаў супраць крымскіх татараў і турак, набегі якіх спусташалі землі дзяржавы і пагражалі знішчэннем усяму хрысціянскаму свету. Асаблівыя надзеі на поспех місіі ўскладалі на радзіме паэта — у Вялікім княстве Літоўскім, народы якога найбольш цярпелі ад ворага. Для беларуса і адданага патрыёта сваёй дзяржавы наступіла тая зорная гадзіна жыцця, калі ён мог з найбольшай карысцю паслужыць свайму народу. Такі зручны выпадак надарыўся, калі пасольства на чале з Эразмам Вітэліусам назірала аднойчы ў прысутнасці папы Льва X бой быкоў.

Відовішча выклікала ў М. Гусоўскага ўсхваляваныя ўспаміны аб ловах і паляваннях на зубра ў яго на радзіме. Аповед зацікавіў Льва X Медычы,

вядомага аматара паляванняў і мецэната мастацтва, які палічыў пачутае вартым вершаванай паэмы і выказаў Вітэліусу жаданне мець у Ватыкане чучала экзатычнага звера. Імкнучыся скарыстаць выпадак для дасягнення мэт дыпламатычнай місіі, Эразм Вітэліус загадаў Гусоўскаму адразу ж узяцца за працу.

**У 1522 годзе ў Рыме М. Гусоўскі стварыў на лацінскай мове бліскучы літаратурны шэдэўр — «Песню пра зубра».** Паэма з’явілася на свет, калі ні яе ініцыятара папы Льва X, ні яе заказчыка Эразма Вітэліуса ўжо не было ў жывых. Вярнуўшыся ў 1522 годзе ў Кракаў, Гусоўскі пры падтрымцы Альфія Людовіка, сакратара каралевы Боны Сфорца, выдаў свой паэтычны зборнік «Песня пра зубра» з прысвячэннямі высокім асобам.

Тут, у сталіцы Польскага Каралеўства, паэт напісаў яшчэ некалькі твораў. Сярод іх вершы «Суцяшэнне» і «Да боскага Ссбасцяна», а таксама паэмы «Новая і славутая перамога над туркамі», «Жыццё і подзвіг святога Гіяцынта».

**Адзінокі і хворы, свае апошнія гады Гусоўскі дажываў у Кракаве. Памёр ён каля 1533 года.**

(Агучваюцца вынікі работы.)

**2.2.Паглыбленне ведаў пра Міколу Гусоўскага.**

Больш падрабязна пра асветніка вы даведаецеся падчае прагдяду дакументальнай стужкі «Гісторыя Беларусі. Песня пра зубра». Найбольш важныя факты занатоўваеце ў табліцу на аркушах.

| Дата (падзея) | Тлумачэнне |
|---|---|
| Дата нараджэння | |
| Паходжанне | |
| Адукацыя | |
| Знаёмства | |
| 1518 год | |
| Рым | |
| 1522 | |
| Асаблівасці твора | |
| Роля Боны Сфорцы | |
| 1523 год | |
| Лацінская мова | |
| Выснова | |

(Агучваюцца вынікі работы.)

**2.3.Работа над зместам паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага.**

**2.3.1. Інды відуальная работа.**

**Заданне.** Са зместу паэмы «Песня пра зубра» выпішыце біяграфічныя звесткі, звязаныя з асобай Міколы Гусоўскага.

**2.3.2. Узнаўленне зместу твора па плане.**

**Прыкладны план паэмы:**

**І. Любоў паэта да роднага краю, смутак на чужыне:**

1. Сардэчная споведзь, шкадаванне аб незваротным.
2. Незлічоныя багацці беларускіх лясоў.

3. Спрыт і ўмельства простых людзей.
4. Сувязь ліцвінаў з іншымі народамі праз гандаль.
**II. Зубр — цэнтральны «герой» паэмы:**
1. Знешні выгляд зубра.
2. Унутраны» свет асілка.
**III. Цяжкае жыццё нашых продкаў:**
1. Спусташальная сіла войнаў.
2. Феадальнае заняволенне «нізавога» люду.
3. Жорсткасць расправы над прыхільнікамі язычніцкай веры.
**IV. Вобраз князя Вялікага княства Літоўскага:**
1. Вітаўт — прыхільнік справядлівых парадкаў у дзяржаве.
2. Воінская мудрасць князя.
3. Уменне прадухіліць небяспеку Бацькаўшчыны.
**V. Тэма вайны — цэнтральная ў паэме:**
1. Стойкасць народа ў барацьбе супраць захопнікаў- чужынцаў.
2. Асуджэнне міжусобных войнаў і іх зачынальнікаў;
3. Выступленне паэта супраць войнаў у свеце.
**VI. Праблема беражлівых адносін да прыроды:**
1. Замілаванасць роднымі мясцінамі.
2. Горыч сумленнага палявання на зубра.
3. Уменне заўважыць бессэнсоўнае знішчэнне прыроды.
**VII. Сцвярджэнне гуманістычных прынцыпаў дабра і свабоды.**
**2.3.3. Гутарка.**

- ✓ **У які час адбываюцца падзеі ў творы?**
- ✓ **Што вы ведаеце пра ВКЛ?**

**У пачатку 13 ст.на землях Навагрудчыны і Літвы ўзнікае ВКЛ**. У змаганні з ваяўнічымі суседзямі адстаяла яно незалежнасць, сабрала адну дзяржаву літвінскія землі. Ад Міндоўга да Альгерда кожны ўладар ВКЛ, не ведаючы спадчыну, зброяй і дыпламатыяй працягваў славу сваіх папярэднікаў. ВКЛ пры Вітаўце раскінулася ад Балтыйскага мора да Чорнага, ад Бярэсце да ракі Угры-сапраўдная імперыя. Гэта плен Вітаўтавага жыцця. І толькі ён ведаў дарагі кошт сваёй велічы: прыніжэнні, няволя, страты блізкіх, паражэнні, вечны неспакой за лёс дзяржавы, тысячы верстаў дарог, бяссонныяночы.

**Першай сталіцай ВКЛ быў Навагрaдак**, з усходнеславянскім насельніцтвам і культурай. **У 1323 г. Гедымін перанес сталіцу ў Вільню.**

**Вітаўт нарадзіўся ў 1350 г.** Імя свае ен атрымаў, відаць, у гонар язычаскага бога святавіта, якога шанавалі славяне. А можна дапусціць, што азначала яно, як і імя Віцень, «жаданы» або «гаспадар». Вітаўт у штодзенным жыцці размаўляў на старабеларускай мове. Беларускую мову ўжываў Вітаўт і ў перапісцы з стрыечным братам Ягайлам, і ў дзяржаўных дакументах. Гэта дае падставу лічыць Вітаўта беларусам, хаця па тагачаснай традыцыі ен называў сябе ліцвінам. Пра дзейнасць Вітаўта на вялікакняжацкім пасадзе захавалася нямала пісьмовых крыніц: асабістыя граматы, перапіска, сведчанні сучаснікаў, аповядыў летапісах і хроніках. Галоўным настаўнікам княжыча быў сам Кейстут. Ад бацькі пераняў Вітаўт яго доблесць і высакароднасць-

якасці, якія прызнавалі за Кейстутам і крыжакі.

Позірк ягоны, Вітаўта, зачароўваў, што вабіла да яго сэрца кожнага(кажуць, што ен атрымаў гэтую рысу ад маці), любіў абавязваць болей добразычлівасцю, чым дарамі. У адносінах з людзьмі быў строгі, і прыдворныя яго вызначаліся спрытнасцю і пачцівасцю. Вялікі князь шмат працаваў, сам займаўся кіраваннем.

Жадаў ведаць пра ўсе. Пагрозлівы быў толькі ў вайсковы час, але ўвогуле поўны дабраты і справядлівасці, умеў караць і мілаваць. Мала спаў, мала смяяўся, болей халодны быў і разважлівы, чым гарачы 1422 г.- вершыня магутнасці Вітаўта. Ён- чэшскі кароль, і Чэхіі кіруе яго намеснік. Ягоную ўладу прызнае Ноўгарад. Новы стаўленік Вітаўта ўладарыць у Залатой Ардзе. Князь маскоўскі Васіль Дмітравіч прызначыў вялікага князя літоўскага апекуном над сваімі малалетнімі дзецьмі. Значны ўплыў Вітаўта на ўнутраныя польскія справы. Вітаўт нібыта ўвасабляў веліч і магутнасць ВКЛ і Рускага княства. Ніколі за ўсю сваю гісторыю ВКЛ не было такім моцным.

**Нам расказалі пра Вітаўта з пункту гледжання гісторыі і гісторыкаў. М. Гусоўскі паказаў нам гэты вобраз у тэме.**

- ✓ **Паразважайце, што ўвасабляе зубр у паэме?**




- ✓ Скажыце, на якіх пісьменнікаў і вучоных спасылаецца паэт пры апісанні знешнасці і звычак зубра?
- ✓ Чаму зубр выклікае ў М. Гусоўскага адчуванне гонару за сваю зямлю?
- ✓ Якімі дэталямі падкрэсліваецца магутнасць зубра?
- ✓ Каму аддае сімпатыю М. Гусоўскі?
- ✓ Чаму аўтар, характарызуючы Вітаўта, адзначае, што розум яго «сілу радзіме вярнуў, княства вялікім зрабіў»?
- ✓ Што дае паставы М. Гусоўскаму называць эпоху княжання Вітаўта «залатой»?
- ✓ **Як думаеце, чым абумоўлены зварот аўтара да вобраза Вітаўта?**

М. Гусоўскі бачыў, што Радзіма губляе былую магутнасць, незалежнасць. І вінаваціў у гэтым ён уладароў, якія вялі міжусобныя войны,

спусташаючы край. Сучасным уладаром ён супрацьпастаўляе князя Вітаўта, суровага, але справядлівага правіцеля, які дамогся цэнтралізацыі ўлады, а ВКЛ пры ім дасягнула сваіх тэрытарыяльных памераў.)

- ✓ **Якім паўтае перад чытачом князь Вітаўт?**
- ✓ Якімі рысамі М. Гусоўскі надзяляе Вітаўта? Як аўтар ацэньвае вартасць кіраўніка ў адпаведнасці з яго асабістымі здольнасцямі і талентамі?




- ✓ Назавіце, якія тэмы хвалююць паэта, а чытача?
- ✓ З якім пачуццем паэт расказвае чытачу пра пакуты простага люду, разбой прыгнятальнікаў?
- ✓ Да якой грамадзянскай пазіцыі заклікае пісьменнік чытача?
- ✓ Падумайце, ці быў Мікола Гусоўскі па сацыяльным становішчы вельмі блізкі да народных нізоў і добра ведаў іх вусную творчасць?
- ✓ Акрэсліце, як ставіцца М. Гусоўскі да звычаяў, фальклору беларускага народа? Абгрунтуйце ўласнае меркаванне.
- ✓ Дакажыце, што пры гэтым аўтар уступае у сутыкненне з афіцыйнай палітыкай царквы.
- ✓ Супраць каго выступае паэт у творы?
- ✓ Знайдзіце і зачытайце ў тэксце паэмы прыказкі, прымаўкі, народныя выслоўі, растлумачце іх сэнс.
- ✓ Што можна сказаць адносна кампазіцыі паэмы «Песня пра зубра»?
- ✓ З дапамогай якога прыёму ажыццяўляюцца гэтыя пераходы? Ці лёгка заўважыць іх у творы? Чаму?
- ✓ Дакажыце, што М. Гусоўскі рашуча адстойвае свае доказы таго, што адносіцца да самой тэмы, выходзіць за яе рамкі.
- ✓ **Якую праблему падымае у творы?(Тэму вайны і міру)**
- ✓ Паразважайце, ці можна назваць гэты твор высокапатрыятычным? Абгрунтуйце сваю думку радкамі тэксту паэмы.

**2.4.Работа з гексамі.**

**Заданне. Ахарактарызуйце Вітаўта ў адпаведнасці з крытэрыямі.**




**2.5. Індывідуальная работа.**

**Заданне**. Уявіце, што вам трэба напісаць ліст пра Міколу Гусоўскага свайму сябру. На што ў першую чаргу вы звернеце ўвагу? Якімі фактамі з жыцця і дзейнасці асветніка паспрабуеце зацікавіць свайго сябра?

(Агучваюцца вынікі работы.)

**2.6. Хвілінка адпачынку.**

**2.7. Работа ў парах.**

**Заданне А.** Паразважайце, чаму паэма «Песня пра зубра», у якой гучыць трывога за край і народ ды ўслаўляецца мудрасць князя Вітаўта, які мог бы вярнуць Радзіме былую веліч, напісана не на беларускай мове (яна ж пры жыцці М. Гусоўскага была дзяржаўная ў княстве), а на латыні.

**Заданне Б.** Дакажыце, што адным з герояў паэмы «Песня пра зубра» з'яўляецца сам апавядальнік. Калі гэта так, то ў чым іменна выяўляецца асоба аўтара ва ўрыўку «Выдумка гэта карэннем сваім пранікае...»?

(Агучваюцца вынікі работы.)

**2.8. Работа ў групах.**

Прадстаўленне відэахарактарыстык князя Вітаўта (1-я група) і аўтара-апавядальніка (2-я група) на аснове мастацкай стужкі «Песня пра зубра» (рэж. Э. Перагуд, Беларускае тэлебачанне «Тэлефільм», 1980 п).

**2.9. Паглыбленне ў тэорыю літаратуры.**

**А. Дэманстрацыя відэароліка «Гуманізм у літаратуры».**

Б. Работа з вучэбным дапаможнікам. Чытанне артыкула «Гуманізм у літаратуры».

В. Адказы на пытанні вучэбнага дапаможніка.

**III. Кантрольна-карэкцыйны этап.**

**3.1. Абагульненне.**

**Заданне.** Складзіце стужку часу, размеркаваўшы ў храналагічнай паслядоўнасці факты з біяграфіі Міколы Гусоўскага.

(Агучваюцца вынікі работы.)

**3.2. Творчасць.**

**Заданне.** Складзіце сінквейн з апорным словам «Мікола Гусоўскі» на аснове выказвання Янкі Сіпакова: «Паэзія Міколы Гусоўскага — гэта нашы вочы ў мінулае, Яна, нібы машына часу, дапамагае нам сягаць праз стагоддзі, у даўніну, каб адчуць і нават убачыць, як жылі нашы продкі, чым займаліся, што іх радавала і што засмучала...».

(Агучваюцца вынікі работы.)

**3.3. Зварот да эпіграфа.**

- ✓ **Прачытайце словы Ніла Гілевіча і Уладзіміра Калесніка. Як вы іх разумееце?**

**3.4. Тэматычны кантроль.**

Выкананне тэставага задання па паэме «Песня пра зубра» М. Гусоўскага. (Здача работ на праверку настаўніку.)

**IV. Дамашняе заданне.**

- ✓ Прачытаць артыкул «Мікола Гусоўскі» вучэбнага дапаможніка, адказаць на пытанні да яго.
- ✓ Напісаць водгук на мультфільм «Песня пра зубра» (рэж. А.Белавусаў, «Беларусфільм», 1982), рэцэнзію на дакументальную стужку «Мікола Гусоўкі: рымскія канікулы» (сцэн. А. Зелянко, Белтэлерадыёкампанія, 2007).
- ✓ Скласці памятку «Карысныя ўрокі паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага».

**V. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак з каменціраваннем. Рэфлексія.**

Працягніце выразы: «Сёння на ўроку я зразумеў...», «Урок даў мне для жыцця...», «Пасля ўрока мне захацелася...». (Агучваюцца вынікі работы.)